**ПÓЛАЦКІЯ СЕЛЬСКАГАСПАДÁРЧЫЯ ПРАДМÉСЦІ**. Вядомы з пісьмовых крыніц 14–18 ст. Асн. з іх – «сяльцо» Прасмужкі на У ад *Полацкага Вялікага пасада* за валатоўкамі (згадваецца ў 14–18 ст.), манастыр св. Мікалая на Лучне на месцы сучаснай в. Ропна за 5 км уніз па р. Зах. Дзвіна, каля якога, верагодна, існавала слабада (манастыр згадваецца ў акце аб продажы зямлі полацкаму архіепіскапу Іоне пад 1487 як размешчаны ў Полацку), фальваркі 17–18 ст. размяшчаліся на тэр. сучаснага мікрараёна Аэрадром (на ПнУ ад *Полацкага Запалоцкага пасада*). *Дз.У.Дук.*